*Няштатны аддзел*

*ваенна-патрыятычнага выхавання*

# НЕ СТАРЭЕ ДУШОЙ ВЕТЭРАН

ЦЯЖКІЯ ГАДЫ Вялікай Айчыннай вайны... Іх нельга забыць. Памятны яны і Канстанціну Яфімавічу Сапону, слесару ўчастка пад'ёма Другога калійнага камбіната. Яму таксама давялося ваяваць са зброяй у руках з ненавіснымі фашыстамі. Давялося, бо было тады Косцю толькі 15 год.

У партызанскім атрадзе імя Ракасоўскага брыгады «Савецкая Беларусь» ён быў агульным любімцам. У любы час Косця першым сустракаў байцоў, што вярталіся з аперацый праводзіў іх на «чыгунку». Партызанам падабаўся юны і жвавы хлапчук, поўны жадання заўсёды ісці ў бой.

І хадзіў, і рызыкаваў жыццём. Бо партызанскія паходы—гэта не экскурсіі ў населеныя пункты. Гэта кароткія і жорсткія сутычкі з ворагам, захоп трафеяў, смерць баявых таварышаў...

— То былі такія гады, што ваявалі ўсе, хто мог трымаць у руках зброю, — расказвае на просьбы моладзі Канстанцін Яфімавіч. —У ліку іх быў і я. Ды што тут многа расказваць..

А гаварыць ёсць аб чым Сваім шчаслівым лёсам абавязаны мы тым, хто ішоў тады на ворага па закліку партыі і Маці-Радзімы. Мы, вядома, разумеем свайго старэйшага таварыша: не хоча ён паказацца няскромным чалавекам, і расказваць аб тых гадах нялёгка.

Па-геройску змагаўся з гітлераўскай навалай Косця Сапон. На яго грудзях цяпер красуецца медаль «За баявыя заслугі», «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» II ступені, «За перамогу над Германіяй», памятны медаль у гонар 20-годдзя перамогі над фашызмам. Так Радзіма ацаніла па заслугах дзейнасць юнага партызана ў барацьбе з фашызмам.

Мы ведаем яго як выдатнага работніка. На рудніку Другога калійнага, працуючы з 1965 года, К. Я. Сапон зарэкамендаваў сябе майстрам на ўсе рукі. За любую справу возьмецца—кіпіць работа ў яго руках. Ніколі не пачуеш ад Канстанціна Яфімавіча, што ў яго няма часу, што яму цяжка. Актыўна ўдзельнічаючы ў грамадскім жыцці калектыву, тав. Сапон шмат свайго часу аддае людзям. Ён —старшыня ўчастковага прафсаюзнага камітэта, член рудкома, старшыня жыллёва-бытавой камісіі, член савета рабочага гонару, дружыннік...

На ўсё знаходзіць час гэты чалавек, усюды спраўляецца. Нездарма ж ён неаднаразова адзначаўся кіраўніцтвам участка і рудніка. Канстанціну Яфімавічу ўручаліся граматы, грашовыя прэміі, падзякі.

А мы, маладыя рабочыя, з павагай глядзім на былога партызана. Хочацца неяк быць падобным на яго, быць такім жа працалюбівым, сціплым. Што і казаць, прыемна, калі з табою побач працуе такі чалавек. І я магу смела сказаць, што паўвекавы юбілей рэспублікі і Кампартыі Беларусі К. Я. Сапон сустрэў дастойна.

**М. БОГУШ,**
**сігналіст участка пад'ёма рудніка, слухач школы рабселькораў.**